**ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ Ў БДУ: ПАМЯЦЬ І ГОНАР**
Урачыстая лінейка, прысвечаная гэтай значнай падзеі, прайшла ў БДУ
Стар. 3

**12 ГЕРОЯЎ САВЕЦКАГА САЮЗА Ў ГІСТОРЫІ БДУ**
Іх імёны назаўжды ўпісаны ў лёс нашай краіны
Стар. 4-5

**НОВЫЯ ГАРЫЗОНТЫ ТЭХНАЛОГІЙ**
БДУ на Digital Expo – 2025
Стар. 6

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

15 ліпеня 2025 года, №7 (2298)

# БЕЛАРУСКА-КІТАЙСКІ МОЛАДЗЕВЫ ФОРУМ ПРАЙШОЎ У БДУ



**Унікальны беларуска-кітайскі моладзевы форум упершыню прайшоў у БДУ. Урачыстае адкрыццё адбылося 24 чэрвеня на базе Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарку. Усяго гасцямі форуму сталі каля 200 таленавітых студэнтаў, маладых навукоўцаў і прадстаўнікоў органаў студэнцкага самакіравання.**



– Гэта новы крок да развіцця і ўмацавання плённага супрацоўніцтва дзвюх сяброўскіх краін, – заявіў рэктар БДУ **Андрэй Кароль**.

Паводле яго слоў, унікальнае мерапрыемства, арганізаванае па ініцыятыве Прэзідэнта нашай краіны **Аляксандра Лукашэнкі**, будзе трывалай асновай для далейшага паглыблення беларуска-кітайскіх узаемаадносін.

– БДУ праводзіць форум сумесна з вядучым універсітэтам Кітая – Пекінскім універсітэтам – у рамках міжуніверсітэцкіх Дзён дружбы і адзінства БДУ і Пекінскага ўніверсітэта, – нагадаў Андрэй Кароль. – Характэрна, што тэматыкай сустрэч гэтага года стала моладзевая палітыка. У нашы дні важна развіваць міжкультурны моладзевы дыялог паміж краінамі, каб умацаваць у сусветнай свядомасці неабходнасць шматвектарнай палітыкі і будовы свету.

У працяг думкі кіраўнік БДУ падкрэсліў важную ролю ўніверсітэтаў у развіцці ўсебаковых адносін паміж дзяржавамі:

– Кітай з'яўляецца стратэгічным партнёрам нашай краіны, такі ж статус ён мае і ў адносінах з БДУ. Мы адзначаем станоўчую дынаміку за апошнія дзесяць гадоў павелічэння колькасці пагадненняў з гэтай краінай. Каля 20% ад агульнай колькасці ўсіх міжнародных дамоў БДУ заключаны па кітайскім вектары. А ўсяго дзейнічае больш за 600 пагадненняў з арганізацыямі з 59 краін.

Андрэй Кароль пажадаў удзельнікам падзеі яркіх уражанняў, унутраных адкрыццяў, новых эмоцый і верных сяброў.

## УСЕБАКОВАЕ РАЗВІЦЦЁ

Адкрыццё форуму наведаў таксама першы намеснік міністра адукацыі **Аляксандр Бахановіч**:

– Беларусь і Кітай звязваюць глыбокія сувязі сяброўства і ўзаемаразумення, правераныя часам. Наша ўсебаковае стратэгічнае партнёрства, заснаванае на прынцыпах даверу, узаемнай павагі і агульных мэт, пастаянна мацнее і ахоплівае ўсё новыя гарызонты.

Як адзначыў Аляксандр Бахановіч, асаблівую ролю ў развіцці адносін паміж Беларуссю і Кітаем адыгрывае супрацоўніцтва паміж універсітэтамі. На яго думку, сёння беларускія і кітайскія ВНУ актыўна ўдзельнічаюць у абмене студэнтамі і выкладчыкамі, рэалізуюць сумесныя адукацыйныя і навуко-

*Працяг на стар. 2-3*

УНІВЕРСІТЭТ
15 ліпеня 2025 года, №7 (2298)



вые праекты, а таксама арганізуюць канферэнцыі і семінары. Першы намеснік міністра адукацыі падкрэсліў, што яркім прыкладам эфектыўнага двухбаковага ўзаемадзеяння з'яўляецца Беларуска-кітайскі моладзевы форум:



– Дадзены форум – гэта ўнікальная платформа для дыялогаў. Тут усе ўдзельнікі змогуць абмяняцца вопытам і практыкамі, прадставіць свае праекты, знайсці аднадумцаў і пачаць новыя сумесныя ініцыятывы.

Ён таксама выказаў упэўненасць у тым, што форум будзе садзейнічаць прафесійнаму развіццю, абмену ведамі, умацаванню сяброўскіх сувязяў і паглыбленню ўзаемаразумення паміж моладдзю Беларусі і Кітая, бо менавіта за моладдзю будучыня двух краін.

На форуме таксама прысутнічаў прадстаўнік Міністэрства замежных спраў. Першы намеснік міністра замежных спраў **Сяргей Лукашэвіч** падкрэсліў, што цесныя і даверныя адносіны паміж Беларуссю і Кітаем магчымыя дзякуючы падтрымцы кіраўнікоў дзяржаў.



– Форум стаў вынікам высокага ўзроўню стратэгічнага партнёрства, а таксама эксклюзіўным прыкладам супрацоўніцтва ў сусветным маштабе, – адзначыў Сяргей Лукашэвіч.

Развіваючы гэтую думку, ён дадаў, што, нягледзячы на турбулентнасць сусветнай палітыкі і крызісныя з'явы ў розных галінах, будучыня выглядае больш аптымістычнай дзякуючы актыўнай і ініцыятыўнай моладзі:

– Мы з вамі шмат і доўга можам гаварыць пра эканамічнае вымярэнне, цудоўнае палітычнае супрацоўніцтва, але сёння Дзень моладзі. А без моладзі немагчымая ні сучаснасць, ні будучыня.

## АСНОВА СЯБРОЎСТВА – НАША МОЛАДЗЬ

Пра важнасць правядзення форуму распавёў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь **Чжан Вэньчуань**. Ён падкрэсліў, што цяпер асабліва важна развіваць сувязі і кантакты паміж моладдзю для фарміравання прагрэсіўнай будучыні.



– Моладзь – гэта асноўныя носьбіты беларуска-кітайскага сяброўства. Дадзены форум дапаможа ўмацаваць агульныя погляды на будучыню, развіць унутраны патэнцыял і здольнасці, а таксама захаваць цёплыя ўзаемаадносіны дзвюх краін для іх перадачы наступным пакаленням, – адзначыў Чжан Вэньчуань.

Прарэктар ПКУ **Нін Ці** падкрэсліла наяўнасць выразнай і надзейнай сістэмы беларускай адукацыі.



– У Беларусі сфарміравалася глыбокая традыцыя развіцця фундаментальных навук, у рамках якой гадуюцца студэнты з імкненнем да інавацый. Сёння, у эпоху тэхналагічнага прагрэсу, гэтая тэндэнцыя як ніколі актуальная, – адзначыла прарэктар.

Акрамя таго, яна выказала спадзяванне на тое, што форум стане эфектыўнай платформай для моладзевых абменаў, адкрытых і даверных зносін, а таксама супрацоўніцтва паміж універсітэтамі Беларусі і Кітая.

Пра ключавыя мэты беларуска-кітайскага форуму распавяла старшыня савета маладых навукоўцаў пры Міністэрстве адукацыі Беларусі **Настасся Кісялевіч**. З яе слоў, гэтая ўнікальная падзея адыгрывае важную ролю ў падтрымцы таленавітых студэнтаў і маладых навукоўцаў, даючы ім магчымасці для інтэграцыі і далейшага росту ў сусветную навуковую супольнасць.



– Форум здольны ўнесці значны ўклад у развіццё навукі, інавацый і тэхналогій, а таксама ва ўмацаванне стратэгічнага партнёрства паміж Беларуссю і Кітаем ва ўмовах зменлівага сусветнага ладу, – падкрэсліла Настасся Кісялевіч.

**Трохдзённая праграма** стартавала ўрачыстай цырымоніяй ускладання кветак да стэлы «Мінск – горад-герой». Працягнулася серыя мерапрыемстваў круглым сталом «Вопыт універсітэтаў Беларусі і Кітая ў працы з таленавітай моладдзю і рэалізацыі моладзевых ініцыятыў» з удзелам кіраўніцтва запрошаных ВНУ, а таксама адміністрацыі БДУ.

Не менш важнай часткай праграмы сталі эўрыстычныя заняткі, праведзеныя Андрэем Каралём для студэнтаў БДУ і ПКУ. Інтэнсіў быў скіраваны на наладжванне эфектыўнай камунікацыі з моладдзю, раскрыццё ўнутранага патэнцыялу студэнтаў, пошук імі новых сэнсаў і лепшага разумення свайго прызначэння для грамадства і краіны ў цэлым. І для многіх гэтыя заняткі былі самымі доўгачаканымі.

Удзельнікі форуму таксама наведалі фарсайт-сесію, прысвечаную прыярытэтным напрамкам супрацоўніцтва маладых навукоўцаў Беларусі і Кітая. Падчас дыскусіі былі закрануты пытанні пашырэння навуковага ўзаемадзеяння, ролі навуковых супольнасцяў і моладзевых асацыяцый ва ўсталяванні кантактаў паміж краінамі, а таксама спосабаў павышэння кампетэнцый студэнтаў у галіне міжнародных сувязяў, кіравання праектамі і камерцыялізацыі інавацый. У выніку абмеркавання ўдзельнікі распрацавалі новыя фарматы сумеснай даследчай дзейнасці і прапановы па іх рэалізацыі.

Таксама на форуме была выстава інавацыйных распрацовак маладых даследчыкаў з абедзвюх краін. Прадстаўленыя навуковыя праекты








накіраваны на рашэнне актуальных задач у галінах медыцыны, ветэрынарыі, космасу, інфармацыйных тэхналогій, лінгвістыкі, прамысловасці і інш.

Вынікам сумеснай працы студэнтаў на форуме стала прыняцце дэкларацыі моладзі дзвюх краін. У гэтым дакуменце маладыя навукоўцы ўзялі на сябе абавязак выконваць гістарычную місію – працягваць сяброўскія традыцыі, умацоўваць супрацоўніцтва і сумесна будаваць будучыню. У дэкларацыі падкрэсліваецца, што маладыя людзі з'яўляюцца пасланцамі міру і стваральнікамі вялікіх перспектыў, якія выступаюць за вырашэнне канфліктаў шляхам дыялогу. Сярод калектыўных намераў таксама заяўлена імкненне да развіцця, асваення перадавых дасягненняў чалавечай цывілізацыі з мэтай сумеснай пабудовы гарманічнага і шматвектарнага свету.



Праграма працягнулася на спартыўнай пляцоўцы Рэспубліканскага дзяржаўнага вучылішча алімпійскага рэзерву, дзе адбылася таварыская гульня ў баскетбол паміж жаночымі студэнцкімі зборнымі БДУ і ПКУ.

## МАРШРУТАМІ ПАМЯЦІ І ПРЫРОДНАЙ СПАДЧЫНЫ

У другі дзень насычанай праграмы, 25 чэрвеня, для ўдзельнікаў форуму была арганізавана серыя асветніцкіх і экскурсійных мерапрыемстваў. Галоўным пунктам праграмы стала паездка ў Брэст. Выбар гэтага горада абумоўлены 80-годдзем Вялікай Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Удзельнікі форуму наведалі мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», дзе азнаёміліся з асноўнымі экспазіцыямі гістарычнага месца. У 1941 годзе гарнізон крэпасці першым прыняў на сябе ўдар нямецка-фашысцкіх войскаў і на працягу месяца герaічна абараняўся ў поўным акружэнні. Сёння Брэсцкая крэпасць з'яўляецца сімвалам гераізму, вернасці доўгу і любові да Радзімы.

Працягам асветніцкай праграмы стала наведванне нацыянальнага парку «Белавежская пушча» – адной з галоўных прыродных славутасцяў Беларусі. У запаведных лясах расце каля 1000 відаў раслін, жыве больш за 12000 відаў жывёл і птушак, у тым ліку рэдкія і ахоўныя віды.

## АД КАЛІГРАФІІ ДА ВАСІЛЬКОЎ

На трэці дзень удзельнікі форуму паглыбіліся ў свет традыцыйнай і прыкладной творчасці Беларусі і Кітая. Студэнты, выкладчыкі і маладыя навукоўцы беларускіх і кітайскіх ВНУ паспрабавалі свае сілы ў практыкуме па каліграфіі – старажытным мастацтве прыгожага пісьма, якое зарадзілася ў Кітаі каля 4000 гадоў назад. Сёння каліграфія – неад'емная частка кітайскай нацыянальнай культуры.

Акрамя гэтага, для ўдзельнікаў былі арганізаваны майстар-класы па бытавым танцы, ганчарнай справе і роспісе гіпсавых фігурак. Вынікам такой працы стаў васілёк – сімвал Беларусі, які ўвасабляе любоў і вернасць і носіць званне «расліны года».

Завяршэннем творчай сустрэчы стаў канцэрт з вакальнымі нумарамі ў выкананні студэнтаў БДУ і паказам моднага дызайнерскага адзення ад студэнтаў ФСК.

**Таццяна САВІЦКАЯ**

# ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ Ў БДУ: ПАМЯЦЬ І ГОНАР

**Урачыстая лінейка, прысвечаная Дню Незалежнасці Беларусі, прайшла ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. 3 ліпеня – дзень вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, памяці пра гераізм народа. У гэты дзень беларусы ўшаноўваюць сваю гісторыю, культуру і традыцыі, усведамляючы каштоўнасць свабоды і незалежнасці.**

Мерапрыемства пачалося з урачыстай цырымоніі ўздымання Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, сцягоў горада-героя Мінска і БДУ. Працаўнікі, студэнты і кіраўніцтва ўніверсітэта разам выканалі гімн нашай краіны.

Прывітальнае слова прысутным адрасавала прарэктар па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце **Ганна Бакун**. У сваім выступленні яна акцэнтавала ўвагу на значнасці захавання памяці пра трагічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны і непапраўныя страты, панесеныя савецкім народам:

– Сёння ваенная кінахроніка напоўнена кадрамі вызвалення беларускай сталіцы, падзення нацысцкай сімволікі, радасці змучаных вайной жыхароў Мінска ад сустрэчы з салдатамі Чырвонай арміі, – падкрэсліла прарэктар. – У наш неспакойны час нашчадкам пераможцаў вельмі важна захаваць сапраўдную гісторыю, перадаць яе ў непарапісаным выглядзе наступным пакаленням і быць удзячнымі за спакой, мір і магчымасць развіваць сябе і сваю Радзіму.

Намеснік начальніка па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце Студэнцкага гарадка БДУ **Таццяна Яшына** адзначыла цяжкі шлях беларускага народа да незалежнасці і трагічную гісторыю краіны. Яна заклікала ўсіх сучаснікаў прыкладаць намаганні для захавання мірнай і светлай будучыні.



Студэнтка 3 курса факультэта журналістыкі БДУ **Яніна Клімовіч** падзялілася сваімі думкамі пра значэнне Дня Незалежнасці. Яна падкрэсліла важнасць свята для сучаснай моладзі і ролю маладога пакалення ў развіцці беларускага грамадства і дзяржавы ў цэлым. Студэнт пятага курса біялагічнага факультэта **Яўген Лосеў** таксама павіншаваў прысутных, выканаўшы музычную кампазіцыю «Жураўлі на Палессе ляцяць».

Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, які штогод адзначаецца 3 ліпеня, з'яўляецца галоўным дзяржаўным святам. Яно прымеркавана да вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў падчас Вялікай Айчыннай вайны. У 1944 годзе ў выніку стратэгічнай наступальнай аперацыі Чырвонай арміі «Баграціён» савецкія войскі цалкам вызвалілі беларускую сталіцу і перайшлі да далейшага разгрому нямецкай групы армій «Цэнтр». Гэта перамога стала вырашальным крокам да поўнага вызвалення Беларусі ад фашысцкай акупацыі.

**Таццяна САВІЦКАЯ**

Універсітэт
15 ліпеня 2025 года, №7 (2298)

# 12 ГЕРОЯЎ САВЕЦКАГА САЮЗА Ў ГІСТОРЫІ БДУ

**Гісторыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта напоўнена прыкладамі з жыцця мэтанакіраваных, адважных, рашучых людзей. Вялікая Айчынная вайна, стаўшы цяжкім выпрабаваннем для краіны, вылучыла шэраг герояў у гісторыі ўніверсітэта, 12 з іх былі адзначаны вышэйшай ступенню адрознення – званнем «Герой Савецкага Саюза».**



**Георгію Канстанцінавічу Жукаву**, савецкаму палкаводцу, Маршалу Савецкага Саюза, чатыры разы было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза – у 1939, 1944, 1945 і 1956 гадах. Нарадзіўся 1 снежня 1896 г. Навучаўся ў царкоўнапрыходскай школе, затым наведваў агульнаадукацыйныя курсы. Удзельнічаў у Першай сусветнай вайне. У 1926–1931 гг. выкладаў курс «Вышэйшая дапрызыўная ваенная падрыхтоўка студэнтаў» у БДУ. Падчас Вялікай Айчыннай вайны займаў пасады начальніка Генеральнага штаба, камандуючага франтам, члена Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання, намесніка Вярхоўнага галоўнакамандуючага Узброенымі Сіламі СССР. У 1943 г. Г. К. Жукаву было прысвоена званне Маршала Савецкага Саюза.



**Навум Ільіч Жолудзеў** нарадзіўся 13 студзеня 1922 г. Атрымаў сярэднюю адукацыю. У кастрычніку 1941 г. быў прызваны ў Чырвоную армію. З'яўляўся камандзірам мінамётнага разліку 273-га гвардзейскага стралковага палка 89-й гвардзейскай стралковай дывізіі 37-й арміі Стэпавага фронту. Вылучыўся ў бітве за Днепр, дзе мінамётным агнём прыкрываў пераправу падраздзяленняў палка. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 20 снежня 1943 г. было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з узнагароджаннем ордэнам Леніна і медалём «Залатая Зорка». У 1950 г. Н. І. Жолудзеў скончыў Мінскі юрыдычны інстытут, які ў 1954 г. быў рэарганізаваны ў юрыдычны факультэт БДУ.



**Мікалай Якаўлевіч Зайцаў** нарадзіўся 25 сакавіка 1923 г. У сакавіку–жніўні 1941 г. прайшоў навучанне ў 121-й навучальнай авіяэскадрыллі ГПФ г. Акцюбінск. У жніўні 1941 г. быў прызваны ў Чырвоную армію. У 1943 г. скончыў Чкалаўскую ваенную авіяцыйную школу лётчыкаў. З кастрычніка 1943 г. служыў лётчыкам, затым старшым лётчыкам у штурмавым авіяпалку. У лютым 1944 г. – маі 1945 г. з'яўляўся старшым лётчыкам і камандзірам звяна 996-га штурмавога авіяцыйнага палка 224-й штурмавой авіяцыйнай дывізіі 8-га штурмавога авіяцыйнага корпуса 8-й Паветранай арміі. У перыяд вайны здзейсніў 185 баявых вылетаў на штурмавіку Іл-2. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 29 чэрвеня 1945 г. было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з узнагароджаннем ордэнам Леніна і медалём «Залатая Зорка». У 1966 г. М. Я. Зайцаў скончыў філасофскае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 1967 г. працаваў лабарантам, затым асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі БДУ.



**Аляксандр Андрэевіч Філімонаў** нарадзіўся 9 мая 1918 г. У 1938 г. пачаў навучанне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. 17 ліпеня 1941 г. быў прызваны на службу ў Чырвоную армію. З'яўляўся камандзірам танкавага ўзвода і танкавай роты 5-га гвардзейскага механізаванага корпуса. Браў удзел у баях з нямецкімі захопнікамі ў складзе 2-га Украінскага, 1-га Украінскага франтоў за гарады Белгарад, Харкаў, Палтаву. За геройства, праяўленае падчас штурму Берліна, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 27 чэрвеня 1945 г. было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з узнагароджаннем ордэнам Леніна і медалём «Залатая Зорка». У 1949 г. А. А. Філімонаў скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна, у 1952 г. – аспірантуру.



**Марыя Барысаўна Осіпава** нарадзілася 27 снежня 1908 г. У 1933–1935 гг. навучалася ў Вышэйшай сельскагаспадарчай партыйнай школе імя У. І. Леніна. У 1940 г. скончыла Мінскі юрыдычны інстытут. З першых дзён акупацыі Мінска стала арганізатарам адной з першых падпольных груп, куды ўвайшлі выкладчыкі і студэнты Мінскага юрыдычнага інстытута. Са жніўня 1941 г. падпольная група пачала выкананне разведвальна-дыверсійных заданняў. Адным з такіх стала аперацыя «Адплата» ў ноч на 22 верасня 1943 г., падчас якой быў ліквідаваны генеральны камісар Генеральнай акругі Беларусь Вільгельм Кубэ. Марыя Барысаўна разам з падпольшчыцай Марыяй Рыгораўнай Грыбоўскай, пераадольваючы шэраг перашкод, даставіла з партызанскага атрада «Дзіма» ў Мінск дзве міны. Потым адна з мін была задзейнічана падчас аперацыі «Адплата», і заданне было паспяхова выканана. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 29 кастрычніка 1943 г. М. Б. Осіпавай было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з узнагароджаннем ордэнам Леніна і медалём «Залатая Зорка». Пасля вайны ўдзельнічала ў ветэранскім руху і захаванні памяці пра Вялікую Айчынную вайну.



**Якаў Уладзіміравіч Смушкевіч** нарадзіўся 1 кастрычніка 1902 г. У 1923–1926 гг. навучаўся на прававым аддзяленні факультэта грамадскіх навук БДУ. У 1932 г. скончыў Качынскую ваенную школу лётчыкаў. У 1936–1937 гг. удзельнік Грамадзянскай вайны ў Іспаніі. За праяўленыя мужнасць і гераічнасць пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ўказам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 21 чэрвеня 1937 г. было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з узнагароджаннем медалём «Залатая Зорка». У 1939 г. удзельнічаў у баях на Халхін-Голе ў Манголіі. 17 лістапада 1939 г. было прысвоена званне двойчы Героя Савецкага Саюза з узнагароджаннем другім медалём «Залатая Зорка». З 19 лістапада 1939 г. з'яўляўся начальнікам ВПС Чырвонай арміі. Браў удзел у савецка-фінскай вайне 1939–1940 гг. 4 чэрвеня 1940 г. было прысвоена вайсковае званне генерал-лейтэнанта авіяцыі. У снежні 1940 г. заняў пасаду памочніка начальніка Генеральнага штаба Чырвонай арміі па авіяцыі.



**Дзмітрый Пятровіч Жмуроўскі** нарадзіўся 10 студзеня 1918 г. У 1938 г. скончыў Данецкі індустрыяльны рабфак. Затым пачаў навучанне ў Магілёўскім педагагічным інстытуце. У ліпені 1941 г. прызваны ў Чырвоную армію. Ваяваў на Бранскім, Калінінскім і 2-м Украінскім франтах. Да 26 сакавіка 1944 г. Дзмітрый Пятровіч з'яўляўся сяржантам кулямётнага ўзвода 936-га стралковага палка 254-й стралковай дывізіі 52-й арміі. У гэты дзень ля ракі Прут у Малдове павінен быў адбыцца складаны бой, падчас якога трэба было пераадолець водную мяжу, захапіць плацдарм і прасунуцца з узводам у глыб Румыніі. Узначальваючы групу байцоў, Дзмітрый Пятровіч фарсіраваў Прут і, праявіўшы мужнасць і гераічнасць, вызваліў ад захопнікаў сяло Кырпіцы. Далей Дзмітрый Жмуроўскі кіраваў наступам у напрамку горада Ясы. У выніку ўзвод паспяхова заняў «Безназоўную» вышыню і знішчыў 200 варожых салдатаў. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 13 верасня 1944 года было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з узнагароджаннем ордэнам Леніна і медалём «Залатая Зорка». У 1949 г. Д. П. Жмуроўскі скончыў аспірантуру Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута пры кафедры гісторыі КПСС. У 1950 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. У 1960 г. пачаў працу на кафедры гісторыі КПСС БДУ, дзе займаў пасаду выкладчыка, дацэнта, затым прафесара кафедры.



**Міхаіл Паўлавіч Катлавец** нарадзіўся 25 кастрычніка 1914 г. У 1938 г. скончыў Мінскі педагагічны інстытут. Затым быў прызваны на службу ў Чырвоную армію. У 1941 г. скончыў курсы малодшых лейтэнантаў пры Харкаўскім танкавым вучылішчы. Да студзеня 1944 г. з'яўляўся гвардыі капітанам танкавага батальёна 41-й гвардзейскай танкавай брыгады 7-га механізаванага корпуса. У баі каля чыгуначнай станцыі «Лялекаўка» танкавы батальён пад яго камандаваннем знішчыў сем танкаў суперніка. Затым была паспяхова фарсіравана рака Днестр і прарвана абарона суперніка на савецка-румынскай мяжы. Загінуў у баі 6 кастрычніка 1944 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 сакавіка 1945 г. было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з узнагароджаннем ордэнам Леніна і медалём «Залатая Зорка».



**Уладзімір Аляксеевіч Парахневіч** нарадзіўся 18 студзеня 1918 г. У 1933 г. скончыў школу фабрычна-завадскога вучнёўства. Затым працягнуў навучанне на фізіка-матэматычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У жніўні 1941 года далучыўся да падпольнай групы. Да лістапада 1942 г. уваходзіў у 537-ы партызанскі атрад Кіраўскага раёна. Затым У. А. Парахневіч камандаваў дыверсійнай групай. Улетку 1943 г. групай была праведзена аперацыя на ўчастку чыгункі Бабруйск – Жлобін. У. А. Парахневіч сумесна з партызанам Бандарэнкам схавалі на сабе каля 30 кг толу, якія былі дастаўлены да чыгункі. У выніку на чыгунцы групай пад камандаваннем У. А. Парахневіча быў падарваны 21 варожы эшалон, у тым ліку 6 – з жывой сілай суперніка, знішчаны 2 танкі, 23 аўтамашыны, 97 вагонаў з боепрыпасамі і рыштункам, выведзена з ладу 20 паравозаў. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 жніўня 1944 г. У. А. Парахневічу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з узнагароджаннем ордэнам Леніна і медалём «Залатая Зорка».



**Аляксандр Васільевіч Кірсанаў** нарадзіўся 23 снежня 1898 г. Скончыў рэальнае вучылішча, затым вучыўся ў настаўніцкай семінарыі. Са жніўня 1939 г. – камандзір 422-га гаўбічнага артылерыйскага палка 157-й стралковай дывізіі Паўночна-Каўказскай ваеннай акругі, затым служыў у 76-й гвардзейскай стралковай дывізіі. Ваяваў на Заходнім, Бранскім, Цэнтральным, 1-м Беларускім, 2-м Беларускім франтах. Удзельнічаў у Курскай бітве, у Арлоўскай і Чарнігаўска-Прыпяцкай наступальных аперацыях. Асабліва вылучыўся ў бітве за Днепр у 1943 г. Затым ваяваў у Гомельска-Рэчыцкай, Калінкавіцка-Мазырскай, Палескай, Прыбалтыйскай, Усходне-Прускай, Усходне-Памяранскай і Берлінскай наступальных аперацыях. Стралковая дывізія пад камандаваннем А. В. Кірсанава ўдзельнічала ў аперацыі «Баграціён». Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 студзеня 1944 г. было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з узнагароджаннем ордэнам Леніна і медалём «Залатая Зорка». Пасля Вялікай Айчыннай вайны А. В. Кірсанаў у 1955–1960 гг. з'яўляўся начальнікам ваеннай кафедры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 1963 па 1974 гг. займаў пасаду прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце БДУ.



**Аляксей Фёдаравіч Патрын** нарадзіўся 2 мая 1910 г. У 1931–1933 гг. навучаўся ў Агралесамеліярацыйным інстытуце. У 1933 г. быў прызваны на службу ў Чырвоную армію. У 1935 г. скончыў артылерыйскія курсы. Падчас Вялікай Айчыннай вайны з'яўляўся камандуючым 576 артылерыйскага палка 167-й стралковай дывізіі 38-й арміі 1-га Украінскага фронту. Вылучыўся падчас бітвы за Днепр – 3 лістапада 1943 г. ля в. Люцеж забяспечыў прарыў сістэмы абароны суперніка. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 10 студзеня 1944 г. быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медалі «Залатая Зорка». Пасля Вялікай Айчыннай вайны А. Ф. Патрын у 1952–1955 гг. працаваў начальнікам навучальнай часткі ваеннай кафедры і выкладаў курс артылерыі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.



**Павел Антонавіч Гарошак** нарадзіўся 10 чэрвеня 1925. У 1941 г. пачаў навучанне ў Стэрлітамакскай фельчарскай школе. У 1943 г. быў прызваны ў Чырвоную армію. Пасля навучання ў палкавой школе стаў камандзірам кулямётнага разліку ў складзе 1-га мотастралковага батальёна 69-й механізаванай брыгады 9-га механізаванага корпуса 3-й гвардзейскай танкавай арміі Варонежскага, затым 1-га Украінскага фронту. Вылучыўся ў бітве за Днепр 1943 г. Падчас бою знішчыў 9 нямецкіх салдатаў. Апрача абавязкаў камандзіра выконваў абавязкі медыка. Аказаў медыцынскую дапамогу на месцы 26 параненым, вынес з зоны абстрэлу 32 параненых са зброяй. Браў удзел у Кіеўскай наступальнай аперацыі. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 17 лістапада 1943 года было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з узнагароджаннем ордэнам Леніна і медалём «Залатая Зорка». Пасля Вялікай Айчыннай вайны П. А. Гарошак у 1951 г. скончыў Мінскі юрыдычны інстытут.

Выкладчыкі і студэнты БДУ ўнеслі значны ўклад у дасягненне перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Захаванне памяці пра іх жыццё і дзейнасць з'яўляецца важным аспектам працы музея гісторыі БДУ.

**Дар'я АРТАМОНАВА**

УНІВЕРСІТЭТ
15 ліпеня 2025 года, №7 (2298)

# НОВЫЯ ГАРЫЗОНТЫ ТЭХНАЛОГІЙ: БДУ НА DIGITAL EXPO – 2025

**БДУ прадставіў 14 інавацыйных распрацовак на міжнародным форуме па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях «ТІБО – 2025». Пра навуковы і адукацыйны патэнцыял ВНУ расказаў рэктар Андрэй Кароль. Ён адзначыў важнасць бесперапыннага развіцця розных сфер у сучасным свеце высокіх тэхналогій.**

– Цяпер мы бачым імклівае павелічэнне колькасці навацый у галіне інфармацыйных тэхналогій. Яны патрабуюць комплекснага навуковага вывучэння. У далейшым гэта дазволіць эфектыўна выкарыстоўваць дадзеныя распрацоўкі дзеля эканамічнага і сацыяльнага дабрабыту ўсяго грамадства, – расказаў рэктар.

## БЕСПЕРАПЫННАЕ РАЗВІЦЦЁ – ЗАЛОГ ПОСПЕХУ

Міжнародны форум «ТІБО» з'яўляецца платформай для абмену вопытам, для абмеркавання дзяржаўнай палітыкі ў сферы інфармацыі, стварэння інавацыйных ведаў і вывучэння спосабаў укаранення сучасных тэхналагічных тэндэнцый у эканоміку, бізнес і паўсядзённае жыццё.

– Выстава тэхналогій выступае пляцоўкай для кансалідацыі сіл навуковай супольнасці па вырашэнні актуальных задач сучаснасці. Яна паказвае глыбокі інфармацыйны і тэхнічны патэнцыял Беларусі, – дадаў **Андрэй Кароль**. Паводле яго слоў, БДУ імкнецца адпавядаць сусветным тэндэнцыям і выбудоўваць тэхналагічныя прыярытэты краіны. Ён адзначыў важнасць адукацыйнага кампанента ў падрыхтоўцы будучых даследчыкаў, падкрэсліўшы, што поспех прафесійнай рэалізацыі асобы залежыць ад пісьменнага падыходу выкладчыкаў, максімальнай самааддачы студэнта і сучасных праграм навучання.

## КОМПЛЕКС ДЛЯ БУДУЧЫХ ІНЖЫНЕРАЎ АТРЫМАЎ ПРЫЗНАННЕ

Праграмна-апаратны метадычны комплекс, распрацаваны для падрыхтоўкі будучых інжынераў, быў адзначаны дыпломам на міжнародным форуме «ТІБО – 2025». Гэты праект стаў вынікам супрацоўніцтва паміж факультэтам радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій (ФРКТ) БДУ і сярэдняй школай № 30 горада Мінска. Ідэя стварэння комплексу належыць дзевяцікласніку **Сцяпану Варатніцкаму**, прызёру Рэспубліканскага конкурсу даследчых работ, і яго настаўніку інфарматыкі **Дзмітрыю Каменку**. Навукоўцы ФРКТ БДУ, абапіраючыся на іх канцэпцыю, стварылі прамысловыя ўзоры комплексу. Кіравалі праектам супрацоўнікі кафедры інфарматыкі і камп'ютарных сістэм БДУ: загадчык кафедры **Сяргей Семяновіч** і дацэнт **Ігар Сцяцко**.



*Сцяпан Варатніцкі і Дзмітрый Каменка*

– У нас у 10-11 класах адкрываюцца інжынерныя класы, зараз у Мінску іх ужо 92, і яны праводзяць факультатыўныя заняткі па праграмаванні, вывучэнні інфармацыйных тэхналогій. Маё вынаходства стала прататыпам для паўнавартаснай версіі, якую робіць БДУ. Мы хочам прыйсці да масавай вытворчасці. Сэнс гэтай задумкі ў тым, каб палегчыць вывучэнне праграмавання. Да гэтай прылады ідзе метадычная частка з задачамі, з інструкцыяй выкарыстання і перыферыяй, – расказаў Сцяпан Варатніцкі.

Комплекс прызначаны для навучання інжынерным прафесіям навучэнцаў школ, гімназій, ліцэяў, каледжаў і ВНУ Беларусі. Ён уяўляе сабой камп'ютарызаваную сістэму, якая ўключае цэнтральны мікракантролерны модуль, датчыкі і выканаўчыя прылады. Падчас навучання будучыя інжынеры змогуць вывучыць прынцыпы канструявання аўтаматызаваных сістэм і праграмавання мікракантролераў, неабходных для кіравання інжынернымі распрацоўкамі на аснове збору, апрацоўкі і аналізу лічбавых даных.




*Музычны інтэрфейс*

## СУМЯШЧАЕМ ПРЫЕМНАЕ З КАРЫСНЫМ

Яшчэ адну інавацыйную распрацоўку «Музычны інтэрфейс на аснове платформы Arduino» прадставіла на выставе студэнтка факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ **Анастасія Шчэрбач**. Дадатак дазваляе выбраць бібліятэку гукаў са спісу.

– Гэта музычны сімулятар з лазернымі прамянямі, на якім можна выбіраць розныя бібліятэкі гукаў, любыя інструменты, мяняць іх праз дадатак. Я бачыла падобныя праекты з лазернымі арфамі. Хацелася крыху палепшыць, зрабіць больш кампактна. Дадала змяняльнасць бібліятэк гукаў. Я такога ні ў кога яшчэ не бачыла. Разам з усёй распрацоўкай на гэты праект сышло два месяцы.

Функцыянал у прылады шырокі: змена бібліятэкі гукаў, загрузка ўласных бібліятэк, прысваенне ўнікальнай назвы і вокладкі дададзенаму набору трэкаў, змена ўзроўню гучнасці і пошук бібліятэкі па назве. Праект быў таксама прадстаўлены на міжнароднай алімпіядзе «IT-Планета – 2025» і стаў дыпломным праектам студэнткі.

– Гэта проста цудоўны прыклад таго, як адзін жа праект можа стаць і інавацыйнай распрацоўкай для выставы, і тэмай дыплома. Першапачаткова комплекс для сінтэзу музычных твораў з'явіўся ў рамках дыпломнай работы Анастасіі. Для мяне як навуковага кіраўніка гэта проста ўдача – сустрэць такую таленавітую і ўнікальную студэнтку. У адрозненне ад многіх студэнтаў, якія займаюцца толькі праграмаваннем, яна ўсё распрацавала і спаяла сама, – расказаў **Сяргей Маркаў**, дацэнт кафедры шматпрацэсарных сістэм і сетак.



*Сяргей Маркаў і Анастасія Шчэрбач*

У экспазіцыі таксама дэманструецца распрацоўка для дыягностыкі дробных артэрыяльных сасудаў. Ідэя і яе ўвасабленне ў жыццё належаць камандзе з ФРКТ БДУ, у якую ўвайшлі магістрант Аляксандр Лебядзеўскі, трэцякурснікі Сяргей Славінскі, Георгій Панчанка і Мікіта Гвоздзеў, а таксама старшы выкладчык кафедры квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі Канстанцін Шуліко. Кіруе камандай дацэнт той жа кафедры Уладзімір Фірага.

Новая распрацоўка дазволіць выяўляць сардэчна-сасудзістыя захворванні на ранніх стадыях, прызначаць своечасовае лячэнне і кантраляваць працэс развіцця хваробы.

Для дыягностыкі парушэнняў у працы крывяноснай сістэмы неабходна абследаваць не толькі буйныя артэрыі і вены, але і драбнейшыя сасуды. Аднак пакуль іх малыя памеры ўскладняюць абследаванне. Распрацоўка БДУ накіравана на рашэнне гэтай праблемы і спрашчэнне працэсу ацэнкі стану дробных артэрыяльных сасудаў.

Для гэтага распрацаваная мікрасхема счытвае даныя з некалькіх медыцынскіх прыбораў, такіх як




*Праграмна-апаратны метадычны комплекс*




*Прылада рэгістрацыі комплексу фізіялагічных параметраў артэрыяльных сасудаў мікрацыркулятарнага рэчышча*

датчыкі пульсавай хвалі, электракардыяграма, фотаплетызмаграма, спектрометр і іншыя. Паказанні прыбораў утрымліваюць інфармацыю пра хуткасць крывацёку і пульсавай хвалі ў артэрыяльных сасудах, сярэдні дыяметр прасвету артэрыёл пальцаў рук і ног, каэфіцыент расцяжэння сценак артэрыёл і іншыя параметры. Атрыманыя даныя загружаюцца ў камп'ютар, дзе адбываецца комплексная апрацоўка, аналіз, візуалізацыя і захаванне ў лічбавым фармаце. Вынікам з'яўляецца зводка пра стан дробных сасудаў пацыента.

Таксама на стэндзе БДУ сярод адукацыйных распрацовак была прадстаўлена электронная версія вучэбнага нагляднага дапаможніка «Атлас беларускай дзяржаўнасці». Ён змяшчае 74 старонкі з поўнакаляровымі картамі, ілюстрацыямі, гістарычнымі звесткамі і практычнымі заданнямі. Наступным экспанатам стаў навукова-вучэбны лазерны комплекс па аптычным маніпуляванні мікрааб'ектамі – аптычны пінцэт. Гэтая распрацоўка фізічнага факультэта дазваляе кіраваць мікраскапічнымі аб'ектамі, захопліваць і перамяшчаць іх з дапамогай лазерных прамянёў, вымяраць сілу захопу мікрачасціц для светлавых палёў рознай структуры, палярызацыі і інтэнсіўнасці. Акрамя таго, ФРКТ прадставіў вучэбна-даследчы комплекс для вымярэння аптычных характарыстык і счытвання інфармацыі з масіву дэфектаў у празрыстых аб'ектах – аналаг тэхналогіі Project Silica ад Microsoft. У адрозненне ад традыцыйных носьбітаў, шкляная «памяць» больш устойлівая да механічнага зносу і знешніх уздзеянняў і здольная захоўваць інфармацыю без пагаршэння на працягу доўгага часу.

Таксама наведвальнікі выставы азнаёміліся з працай праграмнага дадатку BacRegDB – вэбінструмента для пошуку кароткіх сегментаў бактэрыяльнай ДНК, якія ўтрымліваюць генетычны матэрыял бактэрыяльнай клеткі. Сярод экспанатаў вядучай ВНУ размясцілі мультыаб'ектную сістэму для разгортвання групіроўкі атмасферных зондаў, прызначаную для маніторынгу стану навакольнага асяроддзя, вызначэння каардынат аб'ектаў і стану бартавых сістэм спадарожнікаў.

У лік экспанатаў увайшлі таксама вучэбна-даследчыя, апаратна-праграмныя і інфармацыйна-аналітычныя комплексы для вымярэння аптычных характарыстык аб'ектаў, гуку і іншых параметраў. БДУ прадставіў свае распрацоўкі ў раздзелах «Адукацыйная алея» і навукова-тэхнічных распрацовак Міністэрства адукацыі Беларусі.

**Таццяна САВІЦКАЯ**

# СЕРАБРО З МАСКВЫ: СТУДЭНТ БДУ СЯРОД НАЙЛЕПШЫХ НА ПРЭСТЫЖНЫМ ТУРНІРЫ

**Чацвёртакурснік факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Раман Аляксееў заняў другое месца на XVI Міжнароднай алімпіядзе «IT-Планета – 2025» у напрамку «Праграмаванне 1С». Фінал турніру прайшоў у Маскве.**

«IT-Планета 2025» — гэта платформа для папулярызацыі і развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ), а таксама пошуку і падтрымкі таленавітых студэнтаў і маладых спецыялістаў у сферы IT. Арганізатары і партнёр – вядучыя вытворцы камп'ютарных тэхналогій і некамерцыйныя арганізацыі, якія аб'ядноўваюць працадаўцаў у галіне ІКТ.

У спаборніцтвах прынялі ўдзел больш за 20 000 студэнтаў і спецыялістаў з больш чым 1000 адукацыйных устаноў вышэйшай і сярэдняй прафесійнай адукацыі, якія прадстаўлялі сістэмы прафесійнай адукацыі 15 краін.

Па выніках адборачных анлайн-этапаў у фінал выйшлі 360 найлепшых студэнтаў і выпускнікоў з 150 адукацыйных арганізацый вышэйшай і сярэдняй прафесійнай адукацыі Расіі і іншых краін СНД.

БДУ годна прадставілі навучэнцы ФПМІ. У секцыі «Прыкладное праграмаванне if…else» выступілі першакурснікі Максім Банцэвіч, Ніл Дваракоўскі і Арсеній Ханчэўскі. У напрамку «Рабафабрыка – D.I.Y. Робат» свае веды прадэманстравала чацвёртакурсніца Анастасія Шчэрбач. Яна прадставіла праект «Музычны інтэрфейс на аснове платформы Arduino». Студэнт чацвёртага курса Руслан Парфёнаў «змагаўся» за ўзнагароды ў катэгорыі «СУБД Postgres Pro». Сярэбраным прызёрам у напрамку «Праграмаванне 1С» стаў чацвёртакурснік Раман Аляксееў.

Да 4 курса пра праграмаванне на мове 1С Раман не задумваўся, пакуль не з'явілася магчымасць. Таму для яго другое месца стала прыемным сюрпрызам:

***– Якія эмоцыі вы адчулі, калі сталі сярэбраным прызёрам? Ці быў наогул да гэтага вопыт удзелу ў падобных мерапрыемствах?***

*– Я ў падобных мерапрыемствах не ўдзельнічаў, максімумам быў абласны ўзровень алімпіяды па прадмеце ў школе. Прызавое месца стала для мяне нечаканасцю, таму што першапачаткова ехаў без асаблівых чаканняў і разглядаў гэта хутчэй як цікавы вопыт.*

На факультэце ФПМІ на спецыяльнасці «прыкладная матэматыка» вывучэнне 1С было прапанавана ў якасці спецкурса пры выбары кафедры «Тэхналогіі праграмавання» на трэцім курсе. Спецкурс вяла дацэнт кафедры Алена Ляўчук. Ён быў прысвечаны асноўным магчымасцям платформы.

*— Калі я паспрабаваў працаваць з платформай, зразумеў, што хачу займацца менавіта гэтым. Прывабіў зручны інструментарый, а таксама рэальная практычная карысць, бо ў нашым рэгіёне 1С з'яўляецца лідарам у пытаннях аўтаматызацыі бізнес-працэсаў прадпрыемстваў. Варта таксама як перавагу адзначыць тое, што платформа – расійская, і таму ўвесь код можа быць напісаны на рускай мове, і ўся дакументацыя даступная таксама на ёй.*

Спачатку Раман вывучыў спецкурс ва ўніверсітэце, а затым перайшоў да самастойнага навучання. Дзякуючы свайму выкладчыку ён атрымаў магчымасць прайсці пераддыпломную практыку ў кампаніі, якая спецыялізуецца на працы з гэтай платформай. Пасля знайшоў размеркаванне, але ўжо ў іншую кампанію.

Міжнародная алімпіяда «IT-Планета – 2025» – гэта конкурс для самых лепшых, таму заданні там адпаведныя.

***– Як праходзіла падрыхтоўка да алімпіяды? Якія рэсурсы і матэрыялы вы выкарыстоўвалі?***

*— Рыхтавацца да алімпіяды было цяжка, таму што я не ведаў, чаго чакаць. Спачатку нібыта была самая звычайная задача для чалавека, які працуе ў 1С, потым раптам з'явілася тэорыя раскладаў, а ў фінале ўжо зноў была звычайная задача. Фактычна ўся мая падрыхтоўка складалася з паўтарэння матэрыялаў мінулых курсаў, якія б дапамаглі мне ў рашэнні задачы тэорыі раскладу. Варта адзначыць, што з платформай я рэгулярна працую з верасня мінулага года, і, на мой погляд, менавіта дзякуючы гэтаму я дабіўся поспеху.*



На першым этапе неабходна было прайсці тэст і выканаць заданне па чытанні excel-файла. На другім этапе неабходна было вырашыць задачу размеркавання работнікаў для найбольш хуткага выканання плана работ з выкарыстаннем платформы 1С. А ў фінальным (вочным) – вырашыць задачу складання графіка камандзіровак для работнікаў на аснове плана, які можа быць дапушчальным і недапушчальным. На рашэнне ўдзельнікам вылучылі 4 гадзіны, карыстацца можна было толькі выдадзеным камп'ютарам і спецыялізаваным сайтам.

Самым складаным этапам для Рамана падаўся другі, бо там патрабаваліся веды матэматычнага апарату.

*— Больш за ўсё запомнілася, вядома ж, другая задача, мне здаецца, што пасля гэтага я сваё рашэнне праз пабудову графаў не забуду ўжо ніколі.*

Раман у гэтым годзе абараніў дыплом на тэму «Распрацоўка файлавага менеджара з доступам да воблачных сховішчаў», які таксама звязаны з 1С. І спыняцца ён не збіраецца. Па размеркаванні ён ужо працуе ў ТАА «Х'юмен Сістэм». А алімпіяда, дарэчы, дае не толькі вопыт, але і добрыя знаёмствы, якія могуць дапамагчы з будучай кар'ерай:

*— Ужо пасля праходжання фінальнага этапу мяне спрабавалі запрасіць у расійскую кампанію, якая працуе з 1С. Таксама гэта нейкая магчымасць праверыць свае здольнасці, паглядзець розныя варыянты задач, якія могуць з'явіцца і ў рэальных умовах.*

## САМАЯ ВЯЛІКАЯ ПРАБЛЕМА – АДВАЖЫЦЦА

Раман ужо амаль год працуе з 1С, таму ён сутыкаўся з многімі выпадкамі, калі дадзеная мова праграмавання не ўспрымалася ўсур'ёз або закідвалася на пачатковых этапах.

*— Многія маладыя людзі, якія хочуць працаваць у IT, не ўспрымаюць усур'ёз 1С. У асноўным з-за таго, што не ведаюць патэнцыял платформы. Таму самая вялікая праблема – адважыцца заняцца гэтым. Прызнаюся, да 4 курса я і сам не разглядаў 1С як штосьці сур'ёзнае, чым я буду займацца. Калі ж ужо прынялі рашэнне, што будзеце развівацца ў гэтай сферы, то галоўная першая мэта для маладога спецыяліста – сертыфікат прафесіянала. Для пацвярджэння сваёй кваліфікацыі фірма 1С выдае сертыфікаты. Таксама варта адзначыць, што ў 1С ёсць свой навучальны цэнтр з платнымі курсамі.*

Калі Раман пачынаў самастойнае навучанне, адзіным даступным рэсурсам была кніга «Практычны дапаможнік распрацоўшчыка», якая ўяўляе сабой навучальны матэрыял для пачаткоўцаў, не знаёмых з 1С. Ён лічыць, што прачытанне гэтай кнігі з'яўляецца выдатным адпраўным пунктам. Пасля гэтага, на яго думку, найбольш карысным становіцца рэальны вопыт або вывучэнне іншых навучальных матэрыялаў ад фірмы-распрацоўшчыка.

## ГАЛОЎНАЕ – НЕ ПРАПУСКАЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ

Раман таксама падзяліўся тым, што ў яго заўсёды была і ёсць адна праблема: калі ён хоча нешта зрабіць, то схільны доўга абдумваць, ці сапраўды гэта неабходна, і ў выніку часта адмаўляецца ад рэалізацыі задуманага. Падобны падыход, на яго думку, прыводзіць да страчаных магчымасцяў.

*— На алімпіяду я трапіў толькі таму, што мяне запрасіў сябар, які таксама ездзіў туды са мной. Так што адзінае, што я магу параіць, не баяцца ў чымсьці ўдзельнічаць, менш разважаць і проста рабіць, а таксама не спрабаваць з першага разу чакаць ад сябе самых лепшых вынікаў. Бо нават дрэнны вынік можа стаць паказчыкам, што трэба нешта ў сабе ўдасканаліць, нешта вывучыць больш, а можа, што гэтым у прынцыпе не варта займацца і лепш рабіць нешта іншае.*

**Таццяна САВІЦКАЯ**

### НАВІНЫ МІНСКА І БЕЛАРУСІ

Крыты рынак на Камароўцы плануецца маштабна рэканструяваць на працягу двух гадоў. Абнаўленні чакаюцца ў гандлёвай прасторы, сістэме асвятлення і пашырэнні зоны абслугоўвання.

Беларускія навукоўцы распрацавалі новы метад клетачнай тэрапіі для лячэння цукровага дыябету I тыпу. Лячэнне накіравана на запаволенне разбурэння бэта-клетак і захаванне выпрацоўкі інсуліну.

У чэрвені 2025 года золатавалютныя рэзервы Беларусі павялічыліся на 379,3 млн долараў. Працэс абумоўлены ростам актываў у замежнай валюце і манетарным золаце. Тэмпы росту рэзерваў паскорыліся ў параўнанні з маем. Да 1 студзеня 2026 года Беларусь плануе падтрымліваць аб'ём міжнародных рэзерваў не менш за 7,1 млрд долараў.

Больш за 400 беларусаў сталі індывідуальнымі прадпрымальнікамі дзякуючы дзяржсубсідыям з пачатку 2025 г.

Беларусь і ААЭ падпісалі міжурадавае пагадненне аб гандлі паслугамі і інвестыцыях.

Новы будынак Генеральнага консульства Беларусі адкрыўся ў Санкт-Пецярбургу.

УНІВЕРСІТЭТ
15 ліпеня 2025 года, №7 (2298)

# АД ДЫПЛОМА ДА РАЗМЕРКАВАННЯ: ЯК ПЯЦЬ ВЫПУСКНІЦ БДУ ЗНАЙШЛІ СВОЙ ШЛЯХ У ПРАФЕСІІ

***Адны бачаць у размеркаванні гарантаванае працоўнае месца, іншыя – часовы этап жыцця. Для кагосьці гэта крок да мары, а для кагосьці – прыпынак перад новым рыўком. Пяць дзяўчат, якія скончылі БДУ, расказваюць пра свой вопыт размеркавання.***



**Дар'я Чарняўская**, наша першая гераіня, скончыла механіка-матэматычны факультэт і атрымала кваліфікацыю «Матэматык. Выкладчык матэматыкі і інфарматыкі». Практыкавацца ў прафесіі яна пачала яшчэ на другім курсе – як настаўніца матэматыкі ў 66-й школе Мінска. У выпускным годзе пытанне размеркавання стала для Дар'і асабліва актуальным. Каб прыняць абгрунтаванае рашэнне, яна вырашыла папрацаваць у новым месцы. Выбрала яна родны Барысаў. Там яна год выкладала матэматыку ў адной з мясцовых школ. Гэты досвед стаў неацэнным, менавіта там яна і будзе набірацца вопыту наступныя два гады.

*– Крыху дзіўна быць калегай для людзей, якія яшчэ нядаўна вучылі мяне саму. Але калектыў прыняў мяне цёпла, адносіны ў нас добрыя, – адзначыла дзяўчына.*

Акрамя таго, Дар'я амаль тры гады працуе рэпетытарам. Гэта галіна выкладання прываблівае яе больш за ўсё, таму сваю будучыню яна плануе звязаць менавіта з гэтым.




У 2021 годзе **Вікторыя Гнучых** паступіла на факультэт філасофіі і сацыяльных навук БДУ. Філасофія стала для яе не проста прафесіяй, а стылем жыцця, нягледзячы на тыповае пытанне: «І кім ты будзеш працаваць?» Кожны выкладчык адкрываў прадмет з новага боку. Аднак Вікторыя не лічыць сябе філосафам у поўным сэнсе, бо гэта «не проста кваліфікацыя, а шлях вечнага назірання, пошуку сапраўднага прызначэння мудрагелістай душы». Нечакана для многіх дзяўчына размеркавалася ў сельскую школу ў Мінскай вобласці настаўніцай грамадазнаўства. Яна выбрала гэта месца самастойна, і ўніверсітэт падтрымаў яе, бо на момант размеркавання яна ўжо працавала ў гэтай установе педагогам-арганізатарам. Сумяшчаючы напісанне дыплома і падрыхтоўку да школьных мерапрыемстваў, яна атрымала каштоўны вопыт. Як адзначае выпускніца, час на філасофскім факультэце навучыў яе ставіцца да жыцця і праблем з асаблівым спакоем.

*– Чаканняў ніякіх, я прымаю прыродны парадак рэчаў і не парушаю ўсталяваную гармонію. Проста жыву сваё жыццё і працягваю навучанне ўжо ў статусе магістранткі па той жа спецыяльнасці «Філасофія», бо планую і далей будаваць акадэмічную кар'еру,* – падводзіць вынік Вікторыя.

Размеркаванне – гэта не проста «адпрацоўка», а першы сур'ёзны вопыт. Для кагосьці ён стане трамплінам у кар'еры, для кагосьці – урокам, што трэба шукаць іншыя шляхі. Але ўсе гераіні нашага матэрыялу сыходзяцца ў адным: важна не проста «адпрацаваць», а максімальна выкарыстаць гэты шанец для росту і разумення, куды рухацца далей.




**Вера Ілюкевіч** скончыла факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій па спецыяльнасці «Прыкладная інфарматыка». Выбраўшы на трэцім курсе кафедру інтэлектуальных сістэм, Вера знайшла сваю нішу. За час вучобы ва ўніверсітэце дзяўчына асвоіла амаль усе сферы IT. Працаўладкаванне выдалася хвалюючым. На трэцім курсе яна прайшла сумоўе ў кампанію AiBion, якая займаецца інавацыямі ў галіне медыцыны і аховы здароўя. Працадаўца афарміў заяўку на размеркаванне спецыялісткі, але гладка ўсё не прайшло. Як адзначае выпускніца, за час яе вучобы правілы размеркавання ўскладніліся: цяпер заяўкі прымаюцца толькі ад дзяржаўных устаноў або кампаній, якія ўваходзяць у Парк высокіх тэхналогій. У дзень Х Вера сутыкнулася з нечаканай праблемай: кампанія AiBion, куды яна хацела трапіць на адпрацоўку, не была зарэгістравана ў ПВТ, што выклікала паніку, бо ў базавых арганізацыях выбар IT-кампаній быў невялікі. Выхад з непрыемнай сітуацыі падказала адміністрацыя факультэта. Па іх парадзе студэнтка напісала заяву з просьбай адкласці размеркаванне на месяц. Такі шлях здзівіў нашу гераіню, бо яна, як і шмат студэнтаў, нават не ведала пра такую магчымасць.

*– Далей пачынаецца заблытаная гісторыя. У майго начальніка дзве кампаніі – AiBion, дзе я працавала да размеркавання, і AlgoBrains, якая займаецца распрацоўкай ПЗ для фінансавых арганізацый і, што вельмі важна, з'яўляецца рэзідэнтам ПВТ. За два дні мяне перавялі ў патрэбную арганізацыю, дзе якраз разглядаўся мой удзел у новым праекце. Падрыхтаваўшы новую заяву, мы з маім начальнікам прыехалі на факультэт. У групу падтрымкі я запрасіла і свайго навуковага кіраўніка, які моцна падтрымліваў мяне падчас вучобы. Вось такой дружнай дэлегацыяй мы перадалі маю заяўку камісіі, якая не магла нам адмовіць.*

Праз пэўны час Вера атрымала станоўчы адказ, месца працы ёй ухвалілі. Як дадае дзяўчына, у яе дзейнасці спатрэбіліся веды з розных галін IT, а вось матэматыка і фізіка аказаліся менш запатрабаванымі. У будучыні яна плануе застацца ў кампаніі, бо за час вучобы і працы проста закахалася ў сваю спецыяльнасць.



Выпускніца фізічнага факультэта **Дар'я Янковіч** атрымала кваліфікацыю фізіка-праграміста, што дазваляе працаваць у IT, інжынерыі або навуцы. Месца для адпрацоўкі ў Беларускім дзяржаўным інстытуце стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС) яна знайшла самастойна, на трэцім курсе, убачыўшы аб'яву ў інтэрнэце. Дар'я вырашыла паспрабаваць сябе ў ролі інжынера па метралогіі, што адпавядала яе спецыялізацыі. Размеркаванне ў БелДІСС стала для Дар'і лагічным працягам кар'еры. Хоць гэта месца дало ёй стабільнасць, яна пакуль не бачыць вялікіх перспектыў і плануе развівацца далей, магчыма, у IT-сферы.




**Ксенія Спас**, выпускніца хімічнага факультэта па спецыяльнасці «Хімія. Навукова-вытворчая дзейнасць», атрымала кваліфікацыю «Хімік. Інжынер». Месца размеркавання – лабараторыя хіміі харчовых прадуктаў у Рэспубліканскім цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя (РЦГЭіГЗ) – студэнтка абрала сама. Па словах Ксеніі, магчымасць прайсці практыку на 4 курсе ў дзвюх розных арганізацыях дапамагла ёй вызначыцца. Даведаўшыся ад аднагрупніц пра працу ў РЦГЭіГЗ, яна вырашыла паспрабаваць і не пашкадавала. Самым складаным у падрыхтоўцы да адпрацоўкі стала афармленне дакументаў. Нават з адобранай заяўкай ад арганізацыі мандраж не пакідаў студэнтку аж да дня размеркавання.

Падчас практыкі ў РЦГЭіГЗ яна ўладкавалася на пасаду, і тады ж былі вызначаны яе абавязкі.

*– Чаканні ад размеркавання вялікія. Думаю, што застануся тут і пасля адпрацоўкі. Вельмі добрае месца. Дарога ад дома займае паўгадзіны. Але самае галоўнае – гэта добры калектыў, спагадлівы, чулы. Праца цікавая, хоць спачатку здавалася даволі складанай, але за пару месяцаў я шмат чаму навучылася. І ў будучыні, мяркую, навучуся яшчэ большаму.*

**Марыя КАРКВЕЛІС**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 15.07.2025 г.
Зак. 622. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*